З гісторыі жывёлагадоўлі

М.Ф. АПЕЙКА, бібліятэкар (БАТУ)

Як вядома, свініна складае традыцыйна неабходную прыналежнасць Васілля (1/14 студзеня) і Калядных свят не толькі на нашай Радзіме, але і ў Расіі, Сербіі, Балгарыі, у Сіцыліі, Англіі, Германіі, у краінах Скандынавіі, на Каўказе.А.Весялоўскі лічыў, што славянская і румынская абрадавая свініна адпавядае ахвярапрынашэнню свінні ў рымскім свяце сатурналій. Але, мяркуючы па шырокім распаўсюджанні абрадавай свініны, магчыма меркаваць, што крыніца звычаю, хаваецца ў арыйскай старажытнасці, у рэлігійна-міфічных поглядах першабытных народаў.Звычайнае для нас тлумачэнне абрадавай свініны як сімбаля сонца ўвогуле, хутчэй за ўсё, адпавядае ісціне. Нагодаю для сімбалізацыі Сонца ў вобліку свінні паслужыла доўгая і вострая шчэць гэтае жывёлы, збліжаная з сонечным праменнем. У казках свінка-залатая шчацінка атаясамлівае Сонца.У скандынаваў Фрэйр, бог вясенняга сонца, імчаўся на вепруку Гулінсбурсце. З распаўсюджаннем хрысціянства свіння як сонечны сімбаль набыла дэманічную афарбоўку, і на спінах свіней пачалі ездзіць д"яблы. У жыціях святых у Патэрыку пячэрскім і г.д. шматразова згадваецца той ці іншы "старац у выглядзе беса на свінні"

Старажытныя рымляне вельмі высока цанілі свіное мяса.У рымлян нават існавала асаблівага роду кулінарнае мастацтва (porculatio), якое складалася з наймагчыма вытанчаных спосабаў прыгатавання свініны. Пліній распавядаў, што свіней адкормлівалі сушаным інжырам, потым тушы іх вымочвалі ў віне і фаршыравалі драздамі, жаўрукамі і салаўямі, і гэта быў вядомы Porcus Trojanus (Траянская свіння), названы гэтак з-за ўяўнага падабенства траянскаму каню.

Дарвін лічыў, што свіння - жывёла кемлівая,. разумная, і толькі кароткі век яе звычайнага існавання , утрыманне яе ў цеснай прасторы не дазваляюць яе здольнасцям развіцца па-сапраўднаму. І ў той самы час вядома, што славуты дрэсіроўшчык Дураў вельмі паспяхова працаваў са свіннямі і на арэне цырку гэтыя жывёлы былі вельмі цікавымі артыстамі.

Свінні маюць вельмі тонкі нюх, што дапамагае ім лёгка адшукваць розныя карэнні, земляныя арэхі і г.д.Свіннямі карыстаюцца для пошуку труфеляў.На такіх месцах свінні спыняюцца і пачынаюць капаць зямлю.

У мінулым стагоддзі найбольшай вядомасцю ў свеце карысталіся пароды англійскіх свіней, якіх умоўна падзялялі на тры групы: 1) жывёл дробнай пароды (чорная эсекская, герафордская, суфолкская, белая йоркшырская, віндзорская і інш.); 2) жывёл сярэдняй велічыні, куды належаць белавалосая суфолкская, пярэстая беркшырская і малая йоркшырская; 3) жывёлы буйных памераў: вялікая белая лейчэстарская, вялікая йоркшырская, суфолкская, лінкальншырская. Найбольшай вядомасцю карысталіся ў мінулым стагоддзі йоркшырская і беркшырская пароды.

Паводле дадзеных выставак 1910 года на Беларусі разводзілі , галоўным чынам йоркшыраў, беркшыраў і метысаў гэтых парод. Метызацыя ішла не толькі паміж згаданымі пародамі, але і з мясцовымі, беларускімі, што для тутэйшых умоў дало вельмі станоўчыя вынікі.

Свінні йоркшырскія белай масці, шчэць тонкая і рэдкая, а ў добра адкормленых экземпляраў зусім выпадае.Што тычыцца дробнай йоркшырскай пароды, яна гэтаксама белай масці.Гіганцкія жывёлы буйной йоркшырскай пароды дасягаюць у спрыяльных умовах да 480 кг і болей.

Беркшыры таго часу былі найчасцей чорнай масці з крыху святлейшымі нагамі.Яны дасягаюць гаспадарчай спеласці у 12-16 месяцаў.У адкормленым стане важаць 192-288 кг.Трэба заўважыць, што йоркшыры развіваюцца хутчэй: у 8-10 месяцаў пры добрым гадаванні яны ўжо гатовыя да бойні.

Свіння - жывёла , шматбакова карысная ў сельскай гаспадарцы. Калі ў буйной рагатай жывёле спажыўных частак, г.зн. мяса і сала, ад 2/3 да 1/2, а іншым разам і меней таго, у той самы час у свіннях мяса і сала лічыцца да 8/10, прычым астатняя 2/10 частка - гэта галава, ногі, шчэць, вантробы.Але, калі ўлічыць, што свіная галава таксама ядомы прадукт, вантробы ідуць на гатаванне каўбас, сасісак, сардэлек, нават з крыві робяць каўбасы, а шчэць - прадукт, які ішоў на экспарт па немалым кошце, то можна лічыць свінагадоўлю амаль безадыходнай галіною (пры добрым гаспадаранні, вядома).

Свінні могуць парасіцца у сярэднім 2,5 разы на год, але тры разы шкодна для маткі.Што да плоднасці, то тут свінні саступаюць толькі трусам.Свіння нараджае 10 і нават 12 парасят за адзін апарос.

Свінагадоўля на Беларусі была развітая паўсюдна, апроч месцаў пражывання мусульманаў.Па чыгунцы жывых свіней вывозілі ў Германію, Расію, Аўстра-Венгрыю.

Свіное сала, здор, паляндвіца, шэйка ,шынкі, кумпякі і кумпячкі, каўбасы вараныя, вэнджаныя, паўвенджаныя, сальцісон, вяндліна - усяго нават і не пералічыць, што здольныя нашыя людзі зрабіць са свіное тушы на пажыву і радасць сям"і.

Такім чынам, свінагадоўля на Беларусі заўжды карысталася традыцыйна вялікім поспехам. І Каляды, і Васіллё, і Вялікдзень,і іншыя святы тут заўжды былі звязаныя не толькі простаю традыцыяй, але і больш даўнімі звычаямі, карані якіх бачым у паганскай , дахрысціянскай яшчэ абраднасці, з жыццём і ўяўленнямі нашых далёкіх продкаў.